Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_______________Ю. П. Бондар
«____»______________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАСТАЦТВА НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ І РАМЁСТВАЎ БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01- 04 Народная творчасць*
*(народныя рамёствы)*

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Л. У. Дамнянкова,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Б. А. Лазука,* загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*В. В. Калацэй,* загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 23.02.2015);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад12.03.2015)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Л. У. Дамнянкова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі» з'яўляецца адным з кампанентаў адукацыйнага працэсу, які прадугледжвае неабходны ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (народныя рамёствы)». Праграма вучэбнай дысцыпліны разлічана на засваенне студэнтамі матэрыялу па гісторыі мастацкіх рамёстваў, асаблівасцях узнікнення і развіцця промыслаў на тэрыторыі Беларусі.

Актуальнасць дадзенай дысцыпліны вызначаецца яе роллю ў працэсе падрыхтоўкі студэнтаў да работы ў дамах рамёстваў і іншых установах культурна-адукацыйнага кірунку Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Вывучэнне пэўнага віду народнага мастацкага рамяства ўключае яго характарыстыку, гісторыю ўзнікнення і развіцця, звесткі пра сучасны стан, пра ўзаемасувязь з прафесійным дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам. Авалоданне тэарэтычным матэрыялам у дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню неабходных ведаў для далейшай вучэбнай, педагагічнай і творчай дзейнасці.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі» арганічна звязана з шырокім колам спецыяльных дысцыплін –«Гісторыя мастацтваў», «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва», «Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Культуралогія». Важнай часткай фарміравання прафесійнай падрыхтоўкі з'яўляецца самастойная праца студэнтаў, якая прадугледжвае напісанне рэфератаў, падборку ілюстрацыйнага матэрыялу па вывучаемых тэмах, наведванне выставак, майстэрань майстроў народнага мастацтва.

Асноўны змест вучэбнай дысцыпліны «Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі» ўключае:

– разгляд гісторыі народнага мастацтва Беларусі;

– аналіз асаблівасцей узнікнення промыслаў;

– агляд традыцыйных тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў;

– вызначэнне рэгіянальнай і лакальнай спецыфікі промыслаў і рамёстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Асноўнай мэтай* дысцыпліны з'яўляецца атрыманне сістэмных ведаў па гісторыі развіцця народных мастацкіх рамёстваў і промыслаў Беларусі.

*Задачы дысцыпліны:*

– раскрыццё асаблівасцей традыцыйнай беларускай культуры праз аналіз гісторыі развіцця народных рамёстваў;

– атрыманне ведаў па рэгіянальных адметнасцях народных промыслаў і рамёстваў;

– знаёмства з вядучымі майстрамі і іх творамі ў розных галінах народнага мастацтва;

– фарміраванне ўстойлівага інтарэсу да гісторыі развіцця беларускіх народных рамёстваў, ацэнка іх як крыніцы творчай дзейнасці мастака.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя віды народных мастацкіх рамёстваў;

– гісторыю ўзнікнення і этапы развіцця народных мастацкіх рамёстваў;

– асноўныя этнаграфічныя рэгіёны і цэнтры;

– тэрміны і назвы, неабходныя для аналізу помнікаў матэрыяльнай культуры;

– этапы тэхналагічнага працэсу пры вырабе твораў народнага мастацтва;

*умець:*

– адрозніваць і аналізаваць помнікі народнага мастацтва і рамяства;

– выяўляць узаемасувязь народных мастацкіх рамёстваў з іншымі відамі народнай культуры;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды ў прафесійнай педагагічнай і творчай дзейнасці;

– садзейнічаць развіццю эстэтычных здольнасцей вучняў, пераемнасці нацыянальных традыцый праз адукацыйны працэс;

– выконваць у пэўным матэрыяле рэчы па традыцыйных народных тэхналогіях;

– выкарыстоўваць спецыяльную літаратуру, вучэбныя дапаможнікі, аўтэнтычныя помнікі матэрыяльнай культуры ў вучэбным працэсе.

Вывучэнне дысцыпліны ажыццяўляецца ў ходзе лекцыйных заняткаў з элементамі дыялогу выкладчыка і студэнтаў, семінарскіх заняткаў з абмеркаваннем вынікаў самастойнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма дысцыпліны разлічана на 94 гадзіны, у тым ліку 62 гадзіны аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 12 гадзін, практычныя – 50 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва тэмы | Лекцыі | Лабараторныя |
|---|---|---|
| Уводзіны | 0,5 | |
| Тэма 1. Кавальства і апрацоўка металаў | 1,5 | |
| Тэма 2. Дрэваапрацоўчыя рамёствы | 2 | |
| Тэма 3. Кераміка і ганчарства | 2 | |
| Тэма 4. Традыцыйны беларускі тэкстыль | 2 | |
| Тэма 5. Выраб адзення | 1 | |
| Тэма 6. Пляценне з саломы і лазы | 2 | |
| Тэма 7. Народны роспіс | 1 | |
| Тэма 8. Асноўныя прыёмы работы | | |
| 8.1. Распрацоўка тэхналагічнай карты | | 6 |
| 8.2. Падбор матэрыялаў і абсталявання | | 4 |
| 8.3. Выкананне вырабу | | 36 |
| 8.4. Афармленне вырабу | | 4 |
| **Усяго…** | **12** | **50** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прадмет «Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі». Мэта, задачы, спецыфіка дысцыпліны, яго сувязь з іншымі дысцыплінамі ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі.

Спецыфіка народнага мастацтва: сінкрэтызм, рукатворнасць, прыроднасць і г.д. Формы развіцця народнага мастацтва (аўтэнтычная, стыхійны промысел, адзінкавыя майстры, фабрыкі мастацкіх вырабаў).

Асаблівасці формаўтварэння; сувязь формы і прыёмаў выраб у з функцыяй рэчы; злучэнне эстэтычных і ўтылітарных функцый, улік якасцей прыродных матэрыялаў і іх эстэтычнага патэнцыялу. Традыцыі апрацоўкі матэрыялаў у мастацкім рамястве.

Асноўныя крыніцы па вывучэнні народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў Беларусі.

### *Тэма 1. Кавальства і апрацоўка металаў*

Віды металаў і асноўныя прыёмы іх апрацоўкі: коўка, ліццё, чаканка, гравіроўка, прасечка, дзіфоўка, залачэнне, серабрэнне. Асаблівасці скані і зерні. Характарыстыка асноўных відаў вырабаў з металу.

Кавальства і яго месца ў матэрыяльнай культуры, сферы выкарыстання кавальскіх вырабаў. Асноўныя віды кавальскіх вырабаў. Спосабы і прыёмы здабывання і апрацоўкі сыравіны. Кавальскі горан. Абсталяванне кузні. Інструменты і прылады, якія выкарыстоўваліся ў кавальскай справе. Сучасны стан кавальскай справы.

### *Тэма 2. Дрэваапрацоўчыя рамёствы*

Агульная характарыстыка дрэваапрацоўчых рамёстваў. Матэрыял, спосабы яго апрацоўкі. Аб’екты цяслярнага рамяства. Сталярнае рамяство і сталярныя вырабы: прадметы хатняга ўжытку, прылады працы, мэбля, прыкладныя элементы жылля і гаспадарчых пабудоў. Стальмашнае рамяство і яго асноўныя аб’екты: наземныя транспартныя сродкі, элементы конскай вупражы. Бандарства і бандарныя вырабы.Даўбёжнае рамяство і даўбёжныя вырабы. Такарнае рамяство і разьба па дрэве. Та-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карныя вырабы. Інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваліся ў дрэваапрацоўчых рамёствах.

Віды разьбы ў Беларусі: контурная, выемачная, рэльефная, скразная (ажурная, аб'ёмная).Сферы выкарыстання: прадметы побыту, посуд, транспартныя сродкі, прылады працы, архітэктурныя элементы, скульптура.

*Тэма 3. Кераміка і ганчарства*

Прылады і прыстасаванні для нарыхтоўкі і апрацоўкі сыравіны. Ганчарны круг і яго віды. Інструменты, якія выкарыстоўваліся ў ганчарстве. Горан і яго віды.

Керамічная маса, яе колер; стадыі вырабу керамічных рэчаў: фармаванне, сушка, апраўка, абпал; працэс фармавання вырабу на ганчарным крузе (цэнтроўка, фарміраванне дна, выцягванне сценак, зрэзка). Асаблівасці формаўтварэння: разуменне пластычных якасцей матэрыялу, простыя і ясныя формы (у аснове шар, цыліндр, конус).

Спосабы змяншэння порыстасці і водапранікальнасці: вашчэнне, гартаванне, дымленне, ўжыванне палівы. Спосабы і прыёмы аздаблення керамічных вырабаў: гравіраванне, роспіс; геаметрычныя і раслінныя матывы. Асартымент ганчарных вырабаў.Паступовае пашырэнне форм і прыёмаў аздаблення (роспіс, фляндроўка); далікатнасць дэкору, абмежаваная колеравая палітра. Вядучыя ганчарныя цэнтры рамяства і характарыстыкі іх вырабаў. Мелкая пластыка: гліняная цацка, вытокі і сувязь з сімволікай язычніцкага культу. Асноўныя віды цацак канца XIX− першай паловы XX ст.: свістулькі, бразготкі, фігуркі людзей і жывёл, цацачны посуд.

*Тэма 4. Традыцыйны беларускі тэкстыль*

Ткацтва − адзін з самых пашыраных відаў беларускага народнага мастацтва; гісторыя развіцця народнага ткацтва; тэрміналогія ткацтва; інструменты і матэрыялы.

Віды сыравіны (лён, воўна, каноплі) і прыёмы яе падрыхтоўкі для прадзення. Прылады для прадзення (пралка, верацяно, самапрадка). Апрацоўка нітак. Характарыстыка ткацкага стана, канструкцыя і прынцып работы, эвалюцыя відаў. Выраб тканін. Фарбаванне нітак і тканін.

Тэкстыльныя промыслы, характар і кірункі развіцця ў другой палове XIX−XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя віды традыцыйных тканін: абрусы, ручнікі, пасцілкі, хаднікі, тканіны для адзення, паясы.

Традыцыйная беларуская вышыўка і карункапляценне.Сферы выкарыстання вышыўкі. Тканіны і ніткі для вышыўкі, вышывальныя прыналежнасці. Віды вышыўкі. Традыцыйная арнаментыка вышыўкі. Сімволіка колеру, пашыраныя колеравыя вырашэнні і спалучэнні, час распаўсюджання паліхроміі. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці вышыўкі.

Карункапляценне. Матэрыялы і прылады. Час шырокага распаўсюджання вязання карункаў шыдэлкам, структуры: сетка, фестоны, зубчыкі; матывы: геаметрычныя, раслінныя, заамарфныя. Прызначэнне карункаў. Тэкстыльныя промыслы, характар і кірункі развіцця ў другой палове XIX–XXст.

### *Тэма 5. Выраб адзення*

Функцыі касцюма. Народныя строі і іх састаўныя часткі. Традыцыйны жаночы комплекс. Асноўныя часткі мужчынскага адзення. Тканіны, крой, аздабленне, спосабы нашэння. Верхняе адзенне беларусаў. Асноўныя тыпы крою, тэрміналогія, матэрыялы, колер, аздабленне. Дадатковыя элементы народнага касцюма: пояс, абутак, здымныя ўпрыгожанні.

Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці народнага касцюма.Народныя строі, тэрыторыі і часы бытавання, адметныя рысы.

### *Тэма6. Пляценне з саломы і лазы*

Пляценне з саломы.Характарыстыкарамяства. Матэрыялы і інструменты. Сферы выкарыстанняплеценыхвырабаў. Падзелсаламяныхвырабаў на бытавыя і культавыя. Аграрна-магічнаясімволікасаламяныхвырабаў.Выраб рэчаў з саломы і рагозу; віды пляцення; развіццё тэхнік пляцення. Аздабленні гранёнымі вітымі пляцёнкамі, выпуклымі рамбічнымі ўстаўкамі, перапляценнямі гладкімі палоскамі. Выраб галаўных убораў.Саламяная скульптура і павукі. Аплікацыя саломкай па дрэве і тканіне.

Вырабы з лазы, каранёўдрэў, бяросты.Гістарычныаглядпляцення з лазы і каранёў. Матэрыялы і інструменты. Сферы выкарыстанняплеценыхвырабаў. Тэхналогія выканання вырабаў.

Узнікненне ў XX ст. новых тэхнік, канструктыўных і кампазіцыйных прыёмаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма7. Народны роспіс*

Народны мастацкіроспіс. Матэрыялы і тэхнічныя прыёмы. Сферы выкарыстання мастацкага роспісу: мэбля, транспартныя сродкі, рэчы побытавага і абрадавага прызначэння. Актыўнае развіццё роспісу мэблі з другой паловы XX ст.

Маляванкі, тэхналагічныя асаблівасці роспісу, кампазіцыі і сюжэты. Набіванка – шырока вядомы спосаб дэкарыравання тканін з дапамогай дошак-клішэ. Час узнікнення і распаўсюджання ў свеце і ў Беларусі. Асаблівасці тэхналогіі. Характар арганізацыі матываў. Колеравыя рашэнні. Традыцыйныя вырабы набіванага роспісу.

Пісанкарства – традыцыйны спосаб упрыгожвання велікодных яек. Спосабы атрымання малюнка (васкаванне, гравіраванне).

Роспіс па шкле − новы від народнай размалёўкі; час распаўсюджвання; вытокі рамяства; распісныя рэчы ў аздабленні народнага жылля. Тэхналагічныя асаблівасці роспісу.

*Тэма 8. Асноўныя прыёмы работы*

Разнастайнасць прыёмаў работы з традыцыйнымі для народныхрамёстваў матэрыяламі. Народныя мастацка-рамесніцкія традыцыі: рацыянальнасць работы, улік якасцей матэрыялу і прызначэння вырабаў, сціпласць дэкору, падбор прылад, паслядоўнасць выканання рабочых аперацый; ацэнка якасці вырабу.

Этапы работы над вырабам: падрыхтоўка матэрыялаў, абсталявання, прылад; арганізацыя рабочага месца; выкананне пробнага ўзору, аналіз падбору тэхнік і прыёмаў выканання; пераход да паэтапнай работы над вырабам. Прыёмы апрацоўкі і афармлення твора. Аналіз акасці работы. Тэхніка бяспекі.

8.1. Распрацоўка тэхналагічнай карты.

Аналізтрадыцыйных прыёмаў вырабу рэчы, паэтапны разгляд тэхналогіі, распрацоўка тэхналагічнай карты.

8.2. Падбор матэрыялаў і абсталявання.

Падбор неабходных матэрыялаў і абсталявання, выкананне пробы ў матэрыяле, адпрацоўка прыёмаў работы над вырабам.

8.3. Выкананне вырабу.

Выкананне вырабу адпаведна тэхналагічнай карце, паэтапны аналіз якасці выканання, пры неабходнасці − карэкціроўка.

8.4. Афармленне вырабу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Завяршаючая апрацоўка вырабу (адпаведна абранаму матэрыялу) і яго афармленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯЧАСТКА

### Літаратура


*Асноўная*

*1. Говор, В.* Художественные ремесла и промыслы Белоруссии / В. Говор, Е. Сахута. – Минск : Наука и техника, 1988. – 270 с.

*2. Кацер, М. С.* Народно-прикладное искусство Белоруссии / М. С. Кацер. – Минск : Выш. шк., 1972. – 176 с.

3. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / пад рэд. І. П. Шамякіна [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989.− 575 с.

*Дадатковая*

*1. Курилович, А. Н.* Белорусское народное ткачество / А. Н. Курилович. –Минск : Наука и техника, 1981.− 119 с.

*2. Лобачевская, О. А.* Возьми простую соломку / О. А. Лобачевская, Н. М. Кузнецова. –Минск : Полымя, 1988. – 142 с.

*3. Милюченков, С. А.* Белорусское народное гончарство / С. А. Милюченков. –Минск : Наука и техника, 1984. – 160 с.

*4. Починова, Н. В.* Белорусская народная декоративная роспись: учеб. пособие / Н. В. Починова. –Минск : Выш. шк., 2005. – 174 с.

*5. Селивончик, В. И.* Возрождение ремесла: практ. пособие по ручному узорному ткачеству / В. И. Селивончик, М. Н. Винникова. –Минск : Полымя, 1993. – 144 с.

*6. Фадзеева, В. Я.*Беларуская народная вышыўка / В. Я. Фадзеева. –Мінск : Навукаі тэхніка, 1991. – 199 с.

*7. Шкут, Н. Н.* Белорусские художественные промыслы (изделия из соломки и лозы) / Н. Н. Шкут. – Минск : Наука и техника, 1985. – 158 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныярэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная праца накіравана на фарміраванне навыкаў работы студэнтаў з літаратурай, яе падборам адпаведна тэматыцы, аналізам матэрыялу і яго прадстаўленню ў выглядзе рэфератыўнага паведамлення, прэзентацыі. Выкананне такога роду работы дае магчымасць студэнтам паглыбіць свае веды і прымяніць іх пры напісанні курсавых і дыпломных работ, навукова-даследчых артыкулаў. Работы прадстаўляюцца на практычных занятках і па жаданні студэнта могуць прыняць удзел у канферэнцыях, конкурсах навукова-даследчых работ студэнтаў.

Асноўнай крыніцай для азначэння часавых, ідавых характарыстык вырабаў народнага рамяства з'яўляюцца работы: В. Говор, Е. Сахута. «Художественные ремесла и промыслы Белоруссии» (Минск, 1988), энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі» (Мінск, 1989).

Абавязкова выкарыстанне дадатковых крыніц па гісторыі народнага мастацтва, якія прысвечаны разглядаемаму колу пытанняў (раздзелы: гісторыя мастацтваў, падраздзел: гісторыя ДПМ – 85.1, археалогія, этнаграфія, тэхналогія – 37.2).

Рэкамендаваная структура разгляду матэрыялу:

– агульная характарыстыка перыяду і кірунку развіцця рамяства;

– вызначэнне ўжываемых тэхналогій, спосабаў апрацоўкі;

– разнастайнасць асартыменту вырабаў;

– асаблівасці дэкору: арнамент, размяшчэнне, тэхніка нанясення;

– аналіз найбольш характэрных вырабаў;

– вызначэнне асаблівасцей творчых метадаў майстроў народных промыслаў.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для кантролю за засваеннем студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

– метады вуснай дыягностыкі ведаў (залік);

– метады практычнай дыягностыкі (напісанне рэфератаў, падборка ілюстрацыйнага матэрыялу па вывучаемых тэмах, выкананне практычных заданняў у матэрыяле).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# МАСТАЦТВА НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ І РАМЁСТВАЎ БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01- 04 Народная творчасць*
*(народныя рамёствы)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічнырэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папераофісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк.0,82. Ул.-выд. арк. 0,43. Тыраж экз. Заказ

Выдавец і паліграфічнаевыкананне:
УА «Беларускідзяржаўныўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ